Да прынцыпаў псіхалінгвістыкі адносяцца камунікатыўна-прагматычны і камунікатыўны. Камунікатыўна-прагматычны прынцып ляжыць у аснове механізмаў маўленчатворчасці, параджэння і ўспрымання маўлення ў адпаведнасці з заканамернасцямі псіхафізіялагічных працэсаў дзіцячага арганізма. Гэта азначае, што лепш за ўсё дзеці засвойваюць нормы мовы практычным спосабам у камунікацыі – спецыяльна арганізаванай гутарцы. Камунікатыўны прынцып прадугледжвае разгляд любога маўленчага ўзаемадзеяння з пункту гледжання тэорыі камунікацыі. Урок – гэта камунікацыя суб'ектаў вучэння і навучання: вучань – настаўнік, вучань – вучань, настаўнік – вучні. Дзейнасны прынцып навучання азначае, што вучань самастойна дзейнічае на ўроку (ці ў другой форме навучання), а настаўнік толькі арганізоўвае ўмовы, працэс навучання, кіруе ім.

Такім чынам, разнастайнасць сучасных метадычных сістэм навучання, якія ў той ці іншай ступені ўлічваюць названыя прынцыпы, дазваляе настаўніку выбраць прадуктыўны падыход для ўласнай дзейнасці.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Выготский, Л. С. Избранные психологические исследования / Л. С. Выготский. – М., 1965. – 297 с.

**М. Р. ГАРБАЧЫК**
Брэст, УА "БрДУ імя А. С. Пушкіна"

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах адносіцца да сінтэтычных навук; паняцці "беларуская мова", "выкладанне" і ўласна "методыка" самі па сабе з'яўляюцца навуковымі паняццямі іншых навук – лінгвістыкі, педагогікі, псіхалогіі.

Сучасныя вучоныя-метадысты звязваюць мэты методыкі выкладання беларускай мовы з арганізацыяй дзейнасці двух суб'ектаў педагагічнага працэсу – настаўніка (яго дзейнасць называецца навучаннем) і вучня (яго дзейнасць называецца вучэннем). Таму важнай прынцыповай асновай сучаснай методыкі як навукі з'яўляецца дзейнасны падыход, пры якім педагагічныя працэсы вучэння – навучання разглядаюцца ў першую чаргу як дзейнасць. Дзейнасны падыход, у адрозненне ад многіх іншых псіхолага-педагагічных тэорый, мае зусім канкрэтнае практычнае ўвасабленне – сістэму развіццёвага навучання Д. Б. Эльконіна – В. В. Давыдава.

Ключавой пазіцыяй дзейнаснага падыходу з'яўляецца разуменне сэнсу і сутнасці развіцця. У адрозненне ад прыхільнікаў традыцыйнай

школы, пад развіццём разумеецца з'яўленне ў вучняў не колькасных (мала/многа ведаў, мала/многа ўменняў), а якасных змяненняў – здольнасцей. У межах дадзенай канцэпцыі сфармуляваны ўмовы, пры якіх навучанне становіцца развіццёвым. Навучанне і развіццё – два незалежныя, але звязаныя працэсы. Паводле Л. С. Выгоцкага, навучанне рухае наперад развіццё, а развіццё падрыхтоўвае і робіць магчымым навучанне. Л. С. Выгоцкі ў працэсе эксперыментальнага навучання выявіў неабходнасць вызначэння патэнцыялу вучня, яго магчымасцей з пункту гледжання псіхафізіялагічных асаблівасцей індывіда і назваў гэта "зонай найбліжэйшага развіцця" [1, с. 44].

Цэнтральным паняццем развіццёвага навучання з'яўляецца спосаб дзеяння. Каб адбывалася развіццё, трэба далучаць малодшых школьнікаў да арыенціроўкі, пошуку. Вызначальным і ў тэорыі, і ў практыцы развіццёвага навучання з'яўляецца засваенне пошукавых формаў дзейнасці. Вучням павінны быць створаны ўмовы для развіцця здольнасці ацэньваць свае думкі і дзеянні як бы "збоку", суадносіць вынік дзейнасці з пастаўленай мэтай, вызначаць свае веды і інш.

Паколькі метадычная навука вывучае спосабы выкладання і засваення такой важнай дысцыпліны, як "Беларуская мова", то другой прынцыповай асновай засваення методыкі становіцца камунікатыўны падыход. Гэта значыць, што, вывучаючы беларускую мову, авалодваючы нормамі літаратурнай мовы, вучань робіць гэта ў спецыяльна арганізаванай маўленчай сітуацыі па спецыяльна ўстаноўленых правілах, г. зн. у камунікацыі. Гэты падыход прадугледжвае сістэму сітуацыйных практыкаванняў, накіраваных на фарміраванне камунікатыўна-маўленчых уменняў.

Сучасны падыход да навучання ў пачатковай (і не толькі) школе называюць камунікатыўна-дзейнасным, які ставіць перад метадычнай навукай наступныя мэты: 1) тэарэтычныя: вывучаюцца працэсы авалодання вучнямі ведамі і ўменнямі; даследуюцца заканамернасці, якія ляжаць у аснове навучання-вучэння; вызначаюцца прынцыпы, сродкі, метады навучання; 2) практычныя: распрацоўваюцца абгрунтаваныя рэкамендацыі, як эфектыўна арганізаваць вучэбную (вучня) і навучальную (настаўніка) дзейнасці; выяўляюцца эфектыўныя тэхналогіі навучання.

Камунікатыўна-дзейнасны падыход у метадычнай навуцы вызначае і выбар іншага, чым раней было прынята ў традыцыйнай методыцы, напрамку ў навучанні, які называюць асобасна арыентаваным. Гэта азначае, што на сучасным этапе галоўнай мэтай адукацыйнага працэсу становіцца выхаванне моўнай асобы вучня.

У сувязі з мадэрнізацыяй навучання ў сучаснай школе прыняты кампетэнтнасны падыход. На кожным узроўні вылучаюцца наступныя асноўныя лініі зместу навучання беларускай мове: 1) сістэма мовы, ці веды пра мову, сфарміраваныя ў выглядзе паняццяў і спосабаў дзеяння, а так-

сама валоданне самой мовай, яе нормамі (лінгвістычная і моўная кампетэнцыі); 2) маўленчая дзейнасць (камунікатыўная кампетэнцыя); 3) правапіс (арфаграфія і пунктуацыя) як адзін з самых складаных аспектаў пісьмовай маўленчай дзейнасці (лінгвістычная, моўная і камунікатыўная кампетэнцыі). Станаўленне школьніка як моўнай асобы пачынаецца з 1 класа і адбываецца на працягу ўсяго тэрміну навучання ў асноўнай школе. Урокі беларускай мовы фарміруюць у вучняў веды і ўменні адэкватных маўленчых паводзін. Настаўнік павінен валодаць ведамі аб сучасных напрамках лінгвістыкі, лінгвапрагматыкі, псіхалінгвістыкі, тэорыі маўленчай дзейнасці, тэорыі камунікацыі і павінен быць знаёмы з апошнімі дасягненнямі методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Выготский, Л. С. Педагогическая психология / Л. С. Выготский ; под ред. В. В. Давыдова. – М., 1996. – 297 с.

**В. Н. ГИДРЕВИЧ**
Пинск, ГУО «Средняя школа № 9 г. Пинска»

## ВИЗУАЛИЗАЦИЯ КАК ЭФФЕКТИВНОЕ СРЕДСТВО УСВОЕНИЯ МАТЕРИАЛА НА УРОКАХ МАТЕМАТИКИ В НАЧАЛЬНОЙ ШКОЛЕ

Визуализация в общем смысле – метод представления информации в виде оптического изображения (например, в виде рисунков и фотографий, графиков, диаграмм, структурных схем, таблиц, карт и т. д.). Считается, что зрение обеспечивает человеку около 90 % информации. Визуализация информации – мощный инструмент донесения мыслей и идей до конечного потребителя, помощник в восприятии и анализе данных [1].

Особенно выросла роль визуализации в связи с активным развитием информационных технологий. Мы не успеваем не только усваивать, но порой даже бегло ознакомиться с потоком информации, приходящим к нам через Интернет. И именно средства визуализации облегчают восприятие и помогают нашему мозгу справляться с обработкой сотен терабайт данных.

В учебной деятельности существуют несколько техник графического отображения учебной информации: таймлайн («лента времени»), интеллект-карта (mindmap), скрайбинг, инфографика.

Визуальная составляющая учебных текстов играет особенную роль в обучении младших школьников. Есть графические средства наглядного изображения материала и в учебниках. В них традиционно большое место отводится различного рода таблицам, схемам, моделям, диаграммам, сериям картинок, рисунков, помещенных в строгой последовательности.